УДК 316.75–057.875:323.272

М.Я. Сяменчык
(БДТУ, г. Мінск)

# РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ТЭМАТЫКА Ў ІДЭАЛАГІЧНЫМ ВЫХАВАННІ СТУДЭНТАЎ

Гістарычная памяць – гэта моцны сродак духоўнага адзінства народа і велізарная роля ў яго падтрымцы адводзіцца ідэалагічнаму выхаванню студэнтаў, у будучым – нашай кіруючай эліты. Разам са шматлікімі мерапрыемствамі, якія праводзяцца са студэнтамі, павінен выкарыстоўвацца і ідэйна-выхаваўчы патэнцыял гуманітарных навук. Заўважым, што сусвет імкліва глабалізуецца: разам з тэхнічнымі, музычнымі і іншымі трэндамі ў асяроддзе студэнтаў трапляюць дэструктыўныя ідэі, у тым ліку прывабныя з выгляду лозунгі «каляровых рэвалюцый». Таму выкладчыкі абавязаны растлумачыць студэнтам грамадскую небяспеку захаплення падобнымі «навацыямі».

З гэтай нагоды патрэбна актыўна звяртаць увагу навучэнцаў на багаты вопыт трох рускіх рэвалюцый. Так, на прыкладзе Кастрычніка, відаць, што, бальшавікі, захапіўшы ўладу, распалілі грамадзянскую вайну. Вынікам яе сталі незлічоныя людскія і матэрыяльныя страты. Ва ўмовах аднапартыйнай сістэмы, якая існавала ў СССР з 1922 па 1991 гг., тэма Кастрычніцкай рэвалюцыі зрабілася адной з важнейшых у ідэалагічным выхаванні савецкіх людзей. Слова «рэвалюцыя» мела толькі пазітыўны змест і павінна было натхняць іх на новыя працоўныя подзвігі. Так, у 1987 г. ініцыятары перабудовы абвясцілі аб тым, што «рэвалюцыя працягваецца». У тым, што адбылося ў 1990-я гады, можна было знайсці нешта агульнае з 1917 г. і перш за ўсё – у палітычных крызісах, міжнацыянальных канфліктах, заняпадзе жыццёвага ўзроўню, рапаўсюджанні крывавых «разборак». Пазней гэта з’ява атрымала назву крымінальнай рэвалюцыі. Студэнты павінны пераканацца ў тым, што рэвалюцыі, якога б колеру яны не былі, несумяшчальныя з ідэямі дэмакратыі і прагрэсу, нават са здаровым сэнсам. Любыя праблемы патрэбна вырашаць толькі шляхам рэформ, грамадскай згоды, адкідваючы гвалтоўныя варыянты. Гэтыя ідэі выразна адбіты ў нашай Канстытуцыі і ідэалогіі, засвоіўшы якія студэнцтва абавязкова зробіць свой правільны выбар.

31 снежня 2015 г. у навагоднім віншаванні суайчыннікаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка, акрамя іншага заўважыў, што «да вялікага шчасця нам удаецца зберагчы Беларусь ад войн, тэрарызму і ўнутранай смуты. Дапамагае нам у гэтым і гістарычная памяць народа, перажыўшага на сваім вяку неверагодныя пакуты, і незаменныя страты».

У гэтай сувязі можна сцвярджаць, што істотную ролю ў фарміраванні гэтай памяці ў студэнтаў адыгрывае іх ідэалагічнае выхаванне праз умелае выкладанне грамадскіх навук.